РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 ЛІПЕНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 131 (30519)

## Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення

Віцебск запоўніўся васількамі і зазіхацеў усмешкамі — надышоў час Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Свята, якое сёлета праводзіцца 34-ы раз, славіцца сваімі традыцыямі і кожны год праходзіць з адметным каларытам. Штораз арганізатары стараюцца здзівіць гасцей фестывалю чымсьці новым і ў той жа час захоўваюць яго заўсёдную сутнасць — славянскае адзінства, якое ўмацоўваецца творчасцю.

Абавязковая традыцыя — удзел Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця «Славянскага базару ў Віцебску». Гэты год выключэннем не стаў — кіраўнік дзяржавы зноў даў старт святу ў Віцебскім амфітэатры.

«Найперш я хачу звярнуцца да расіян, украінцаў і беларусаў — тых народаў, прадстаўнікі якіх зацвердзілі некалі гэта вялікае дзейства — «Славянскі базар». Дарагія нашы госці, да вас асаблівая павага і мой зварот: без вас «Славянскі базар» быў бы бедны», — прывітаў гасцей беларускі лідар.

СТАР. 2–3

Фота БелТА.



Прэзідэнт уручыў Гран-пры XXIII Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу беларусцы Амаліі Сухан.

# «НАШ ФЕСТЫВАЛЬ З'ЯЎЛЯЕЦЦА АСТРАЎКОМ ДУШЭЎНАГА ЯДНАННЯ, ЦЯПЛА І СВЯТЛА»



+TV ПРАГРАМА
«ТОЙ САМЫ МЮНХГАЎЗЕН»




ФІНІШНАЯ ПРАМАЯ МЭТАВІКОЎ 4–5



КУПІЎ — І РАСЧАРАВАЎСЯ? 7



У ТРАДЫЦЫІ — СВОЙ СМАК 10

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25131

# «НАШ ФЕСТЫВАЛЬ З'ЯЎЛЯЕЦЦА АСТРАЎКОМ

## «ГЭТА ВЯЛІКАЯ ПАЛІТЫКА»

«Зноў у Віцебскім амфітэатры ўрачыста гучаць фанфары «Славянскага базару» — фестывалю, які заўсёды чакаюць беларусы, віцябчане, майстры мастацтваў і іх прыхільнікі з розных краін. Наш «Славянскі базар» — гэта цэлы свет яркіх эмоцый і незабыўных уражанняў. Тут кожны раз мы сустракаемся са знакамітымі артыстамі і сапраўднымі майстрамі мастацтваў. Тут з году ў год запальваюцца новыя зоркі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што ў Віцебску зоркі запальваюцца ў самых розных жанрах — ад музыкі і танца да тэатральных пастановак і мастацкіх праектаў. У самых розных стылях — ад народнай творчасці і класікі да авангардных кірункаў актуальнага мастацтва.



**«Славянскі базар у Віцебску» даўно выйшаў за рамкі нашага славянскага братэрства, а культурная сталіца Беларусі стала творчай радзімай для многіх любімых намі артыстаў. Мы гэтага і хацелі, адкрываючы калісьці першы фестываль, — падкрэсліў беларускі лідар. — Але самае галоўнае — вось ужо больш за трыццаць гадоў «Славянскі базар» з'яўляецца астраўком душэўнага яднання, цяпла і святла. Нягледзячы ні на якія катаклізмы. Пагадзіцеся, сёння гэта дарагога варта. Мы жывём у век глабальных перамен. Магчыма, самых вялікіх за ўсю гісторыю чалавецтва. Якім будзе свет заўтра, мы сказаць не можам. Гэта самая вялікая праблема. Але дакладна ведаем, што ў гэтым віры абавязкова трэба захаваць свае самабытнасць, культуру, традыцыі.**

Захаваць усім краінам і народам. У гэтым сутнасць разнастайнасці. Гэта крыніца. Адсюль робіцца палітыка. Гэта вы — таленавітыя людзі, знаходзіцеся каля вытокаў любой эканомікі і палітычных падзей».

Па словах кіраўніка дзяржавы, гэта шлях стваральнай працы. Шлях да справядлівай і бяспечнай будучыні для ўсіх нас. «Кажу гэта тут, таму што ў Летнім амфітэатры штогод сустракаюцца таленавітыя выканаўцы з розных краін. І кожны год тут пануе атмасфера сяброўства і павагі. У гэтым сутнасць усёй нашай палітыкі», — адзначыў ён. Аляксандр Лукашэнка адказаў тым, хто лічыць, што «Славянскі базар» па-за палітыкай: «Не. Гэта самая галоўная палітыка.

**Гэта вытокі той палітыкі, якую мы, кіраўнікі дзяржаў (як мы ўжо бачым, не толькі славянскіх народаў) будзем рэалізоўваць. Гэта крыніца. Адсюль усё пачынаецца. Таму гэта вялікая палітыка. Без ксенафобіі і ўсякіх забабонаў. Сумленна і адкрыта, — удакладніў беларускі лідар.**

— Мы ведаем, што пасля завяршэння свята тысячы ўдзельнікаў і яго гасцей вернуцца дадому, натхнёныя атмасферай нашага фестывалю. Яны будуць дзяліцца сваімі ўражаннямі з сябрамі, роднымі і блізкімі. Гэта і ёсць голас фестывалю, голас за мір і сяброўства паміж народамі. Ён павінен быць пачуты. І ён абавязкова будзе пачуты. Нават тымі, хто аглух і слухаць не хоча».

## «БЕРАЖЫЦЕ СВАЮ ГІСТАРЫЧНУЮ ПАМЯЦЬ, БЕРАЖЫЦЕ ТРАДЫЦЫІ»

Прэзідэнт звярнуўся да гасцей фестывалю, да тых, хто прыехаў упершыню, і тых, хто бывае тут кожны год. «Беларусы як ніхто ведаюць, наколькі крохкі мір. Сёлета мы адзначаем 80-годдзе Вялікай Перамогі. Ужо сталі дарослымі праўнукі нашых герояў-пераможцаў, але Беларусь памятае. У гэты святочны вечар я не буду казаць аб страшнай цане Вялікай Перамогі. Перакананы, сто працэнтаў прысутных тут гэта ведаюць. Не буду казаць, колькі ў той вайне загінула таленавітых людзей і колькі не з'явілася на свет...» — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб уроне, які нанеслі акупанты беларускай культурнай спадчыне. Гэта доўгі спіс з дзясяткаў тысяч рэліквій, сярод якіх сакральны Крыж Ефрасінні Полацкай, калекцыя слуцкіх паясоў, старадаўнія іконы і кнігі. У іх, па словах кіраўніка дзяржавы, гісторыя беларускай зямлі, наша ідэнтычнасць. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што і да сёння не ўсё знайшлі, і выказаў агульнае жаданне — каб гэтыя рэліквіі былі страчаны не назаўсёды. «Толькі малая частка тых каштоўнасцяў вярнулася ў Беларусь пасля вайны. Гэта сапраўдны культурны генацыд. Імкненне знішчыць спадчыну народа, пазбавіць яго асновы, — падкрэсліў ён. — Таму, паважаныя нашы сябры, сябры Беларусі, беражыце сваю гістарычную памяць, беражыце традыцыі. У іх — будучыня. Будучыня вашых краін і ўсяго свету, прыгожага ў сваёй культурнай разнастайнасці».



## «СЛАВЯНСКІ БАЗАР» — ГЭТА ЎЖО ЦЭЛЫ СУСВЕТ

Звяртаючыся да ўсіх беларусаў, Прэзідэнт адзначыў, што «Славянскі базар» даўно перасягнуў межы звычайнага фестывалю. «Сёння гэта ўжо цэлы сусвет з вялікай цікавай гісторыяй, сваімі героямі і антуражам, нават з уласнай валютай — «васількамі». На гэтай сцэне выступала нямала знакамітасцяў, сапраўдныя легенды — Людміла Зыкіна, Аляксандра Пахмутава, Іосіф Кабзон, Мішэль Легран, Мірэй Мацьё і многія, многія іншыя, — падкрэсліў беларускі лідар. — З году ў год нашы зорныя госці дораць віцебскай публіцы радасць і прыгажосць, служаць музе і прыхільнікам, застаючыся вернымі дэвізу фестывалю «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення». Перакананы, так будзе

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

# ПА АЛЕІ ЗОРАК, ПРАЗ ГОРАД МАЙСТРОЎ

### Штрыхі да партрэта «Славянскага базару»





Святочная атмасфера «Славянскага базару» закружыла Віцебск. Аб тым, што гэты форум сапраўды міжнародны, сведчыць колькасць краін, прадстаўнікі якіх сёлета ўдзельнічаюць у ім, — 44. Гэту лічбу агучыў міністр культуры Руслан Чарнецкі на традыцыйнай прэс-канферэнцыі ў Міжнародным прэс-цэнтры, які адкрыўся на фестывалі ўчора. Дарэчы, цікавасць журналістаў да падзеі — таксама сведчанне папулярнасці. А сёлета, як расказаў першы намеснік міністра інфармацыі Андрэй Кунцэвіч, для асвятлення «Славянскага базару ў Віцебску» акрэдытаваліся 555 прадстаўнікоў СМІ. Амаль сотня з іх прадстаўляюць замежныя медыя. На акрэдытацыю было атрымана 50 заявак ад блогераў, і ўсе яны задаволены. Самаму малодшаму блогеру — 9 гадоў, ён мясцовы, з Віцебска.

Кожны дзень тут напоўнены новымі яркімі адкрыццямі. Цікавыя спектаклі, выстаўкі, кірмашы, фэст вулічнага мастацтва «На сямі вятрах»... А перад урачыстым адкрыццём Алею зорак Летняга амфітэатра ўпрыгожыла яшчэ адна зорка, якая ўпісала ў летапіс фестывалю імя шматгадовага жадана-га госця «Славянскага базару» — **артыста Юрыя АНТОНАВА**.

## ПОСПЕХ ПАЧЫНАЎСЯ З БЕЛАРУСІ

Па словах артыста, такая ацэнка яго творчасці стала прыемным і чаканым падарункам, асабліва на зямлі, якая адкрыла яму дарогу на вялікую сцэну.

— Беларусь для мяне — другая радзіма. Мая творчая дзейнасць пачалася ў Маладзечне, потым я пераехаў у Мінск, дзе быў прыняты ў Белдзяржфілармонію ў якасці артыста. Ужо 61 год працую на сцэне. Шмат у чым у поспеху маёй творчай дзейнасці адыграла ролю Беларусь, — адзначыў ён.

Юрый Антонаў дадаў, што ён з вялікім задавальненнем прыязджае ў Мінск, а таксама з цеплынёй успамінае гады, праведзеныя ў Маладзечне, сваіх сяброў і першае каханне.

Адметна і тое, што артыст браў удзел у адкрыцці першага фестывалю «Славянскі базар у Віцебску». Ён прызнаўся, што добра памятае той форум мастацтваў, які пачынаўся як фестываль трох братніх славянскіх народаў, і верыць, што аднойчы ўсе зноў сустрэнуцца за сяброўскім сталом.

## БУСЛЫ, КАПЕЛЮШЫ І АБМЕН ДОСВЕДАМ

Візітнай карткай Віцебска падчас фестывалю традыцыйна ста-

# ДУШЭЎНАГА ЯДНАННЯ, ЦЯПЛА І СВЯТЛА»

заўсёды. Кожны год віцебскі музычны конкурс будзе перакідваць масток у будучыню, адкрываць свету новыя імёны».

***Адно з гэтых імёнаў пачулі прама на цырымоніі адкрыцця. Па традыцыі Прэзідэнт уручыў Гран-пры па выніках дзіцячага песеннага конкурсу. «І місія павіншаваць першага пераможцу гэтага года для мяне адна з самых прыемных», — прызнаўся Аляксандр Лукашэнка. Сёлета ім стала беларуская выканаўца — 12-гадовая Амалія Сухан.***

Па словах кіраўніка дзяржавы, вельмі сімвалічна, што ра-










зам з самымі юнымі выканаўцамі ўшаноўваюць і ўладальніка спецыяльнай прэміі «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення». «Прэміі, якая ўручаецца за бездакорнае служэнне любімай справе, гледачу і Яго Вялікасці мастацтву», — заўважыў ён. ***Сёлета ўладальнікам гэтай прэміі стаў Народны артыст Расійскай Федэрацыі Юрый Антонаў.***

Напрыканцы Аляксандр Лукашэнка пажадаў усім мірнага неба (па яго словах, гэта галоўнае), дабрабыту і пазітыўных эмоцый.

«XXXIV Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» абвяшчаю адкрытым! У добры шлях!» — выканаў яшчэ адну традыцыю беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў усім здароўя, а таксама коратка звярнуўся да актуальнай тэмы.

**«Мы апошнім часам столькі шмат гаворым пра штучны інтэлект. Не хачу здацца вялікім знаўцам у гэтай тэме, але я, як толькі гэта з'явілася, вывучаў. Прасунутыя людзі мне сказалі: «Спадар Прэзідэнт, мы не ведаем, куды і да чаго прывядзе». Я гэта чаму кажу: трымайце сваю галаву ў сваіх руках.**

Цяпер ідзе барацьба за розумы і галовы нашых людзей. Як толькі хтосьці захопіць вашу галаву, з намі ўсё будзе вырашана. Ніякія беспілотнікі, ракеты, ваенныя дзеянні не могуць быць паспяховымі, калі ў нашай галаве (як у тых людзей 80 гадоў таму) будзе перамога. Калі мы будзем адданыя, калі мы будзем сябраваць са сваёй галавой, калі мы будзем шанаваць тое, што ў нас ёсць, нам нічога не страшна. Таму беражыце галовы! Асабліва сваіх дзяцей», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

**Валерыя СЦЯЦКО,** *г. Віцебск.*
**Фота БелТА.**

новіцца Горад майстроў, які прыцягвае ўнікальных творцаў з усёй краіны. Яны «Славянскі базар» наведваюць рэгулярна.

— Як толькі з'явіўся наш Дом рамёстваў, мы і пачалі ездзіць на гэты фестываль. Вось ужо 30 гадоў радуем гасцей і жыхароў горада сваёй прадукцыяй, — дзеліцца **загадчыца Лёзненскага Дома рамёстваў Інеса САМУСЕНКА**.

З любоўю і трапятаннем майстры ўпрыгожылі свой стэнд сімвалам краіны — буслікамі, афармленымі ў традыцыйнай ручной тэхніцы «набойка», адраджэннем якой займаецца іх Дом рамёстваў. Таксама тут можна азнаёміцца з іншымі вырабамі, выкананымі ў гэтай жа тэхніцы. Ад разнастайнасці яркіх хустак проста разбягаюцца вочы!

Прыцягнула нашу ўвагу і захопленая саломапляценнем **народны майстар Вольга РЭУТ** з Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору.

— Мае любімыя вырабы — капелюшы. Я дадаю да традыцыйнай тэхнікі ажурнае пляценне, што робіць галаўны ўбор вельмі камфортным у спякотнае надвор'е. А яшчэ гэта выглядае элегантна. Два ўжо забралі. Вось адзін застаўся, — расказала Вольга.






Асартымент вырабаў у яе на любы густ: сухарніцы, падкоўкі на шчасце, букеты кветак, сумкі — як жаночыя, так і мужчынскія.

Мастачка ўдзельнічае ў фестывалі рэгулярна з 1993 года. Як жа змяніўся Горад майстроў за гэты час?

— Вельмі шмат з'явілася новых умельцаў, і ўзровень сапраўды падняўся, — адказала Вольга Рэут. — Цяпер для мяне «Славянскі базар» — гэта ў тым ліку і абмен досведам. Мы з калегамі глядзім, дзелімся ўражаннямі, пераймаем новыя тэхнікі. Заўсёды прыемна бачыць, калі ў кагосьці нешта арыгінальнае атрымалася...



*У Віцебску гэтымі днямі віруе культурнае жыццё ва ўсіх яго праявах. Адкрываюцца новыя выстаўкі, паказваюцца спектаклі і фільмы. І, канешне ж, гучаць песні і музыка. Конкурс маладых выканаўцаў распачнецца 12 ліпеня. У гэты дзень яны выканаюць сусветны хіт, а назаўтра — славянскую песню. У нядзелю вызначыцца пераможца і адбудзецца ўрачыстая цырымонія закрыцця.*

*Пра ўсё гэта мы раскажам у наступных нумарах «Звязды», а яшчэ больш падрабязна і яскрава — на сайце zviazda.by і ў нашых сацыяльных сетках.*

***Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.***

ТЕХНОБАНК

ОАО «Технобанк»
220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Кропоткина, 44.
Телефон +375 17 283 15 10

Форма 1

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2025 года

**Наименование банка: ОАО «Технобанк»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2025 год | 2024 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 3.1 | 224 547 | 208 681 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 3.2 | 1 940 | 1 209 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 3.3 | 132 081 | 143 220 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 3.4 | 331 633 | 318 642 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 3.5 | 115 872 | 90 699 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 3.6 | 507 116 | 474 125 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 3.7 | - | 2 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 3.8 | 26 822 | 23 675 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 3.9 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 3.10 | 4 775 | 3 569 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 3.11 | 29 | 24 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 3.12 | 6 332 | 13 155 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | | **1 351 147** | **1 277 001** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | 3.13 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 3.14 | 53 914 | 27 244 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 3.15 | 960 661 | 925 964 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 3.16 | 11 862 | 23 266 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 3.17 | 49 933 | 46 195 |
| **24** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **1 076 370** | **1 022 669** |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 3.18 | 88 689 | 4 630 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 29 132 | 23 132 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 3.19 | 11 037 | 10 397 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 3.20 | 145 919 | 216 173 |
| **31** | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | | **274 777** | **254 332** |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **1 351 147** | **1 277 001** |

Форма 2

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2025 г.

**Наименование банка: ОАО «Технобанк»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2025 год | 2024 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 54 752 | 35 764 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 24 942 | 15 336 |
| **3** | **Чистые процентные доходы** | **201** | **4.1** | **29 810** | **20 428** |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 24 321 | 22 806 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 5 359 | 5 943 |
| **6** | **Чистые комиссионные доходы** | **202** | **4.2** | **18 962** | **16 863** |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 4.3 | 115 | 84 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 4.4 | 302 | (322) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 4.5 | 34 298 | 30 698 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 4.6 | (63) | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 4.7 | 12 173 | 6 759 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 4.8 | 859 | 1 245 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 4.9 | 44 112 | 36 933 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 4.10 | 2 732 | 2 790 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 25 266 | 22 514 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 5 487 | 5 460 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **19 779** | **17 054** |

**И.о. Председателя Правления** **А.М. Синявский**

**Главный бухгалтер** **Н.А. Кузьмицкая**

**Дата подписания: 02 июля 2025 г.**

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта:
**https://tb.by/about/financial-indicators/**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 10.02.2025 г. УНП 100706562*

АКЦЭНТЫ

# ГАРАНТЫЯ ДЛЯ РЭГІЁНАЎ

## Чым адрозніваецца мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў?

Мэтавікі — гэта гарантыя для рэгіёнаў і падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў. Аб гэтым заявіла намеснік Прэм'ер-міністра Наталля ПЯТКЕВІЧ падчас наведвання Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.



Адказваючы на пытанне аб павышанай долі мэтавай падрыхтоўкі ў медыцынскіх ВНУ, Наталля Пяткевіч падкрэсліла важнасць гэтага механізма як інструмента сувязі практыкі і адукацыі, перадае БелТА. «Мэтавая падрыхтоўка — даволі цікавы і вельмі важны інструмент з пункту гледжання падрыхтоўкі кадраў, таму што гэта рэалізацыя той непасрэднай задачы, калі ёсць сувязь ужо адразу, на этапе падрыхтоўкі будучага спецыяліста, паміж практыкай і адукацыяй, — адзначыла віцэ-прэм'ер. — Арганізацыя, зацікаўленая ў тым ці іншым спецыялісце, накіроўвае свайго прадстаўніка, разумеючы, што паралельна гэта будзе і практыкаарыентаваная адукацыя і чалавек атрымае гарантаванае працоўнае месца».

Паводле яе слоў, у медыцынскай сферы мэтавая падрыхтоўка асабліва запатрабавана па дзвюх прычынах: практыкаарыентаванасць і пастаянная патрэба ў кадрах. «Па-першае, гэта адзін з тых відаў спецыяльнасцяў, дзе практыкаарыентаванасць надзвычай патрэбная. Людзі, якія прыходзяць сюды, павінны дакладна разумець, што яны да гэтага гатовыя і змогуць рэалізавацца як спецыялісты, якія на практыцы прымяняюць атрыманыя веды. Па-другое, у гэтай сферы практычна заўсёды існуюць пытанні недахопу кадраў з-за старэння насельніцтва, абвастрэння пэўных відаў захворванняў і гэтак далей», — растлумачыла Наталля Пяткевіч.

Яна таксама абвергла распаўсюджанае меркаванне аб тым, што мэтавікі — гэта абітурыенты з нізкімі баламі. «Ёсць пэўная прадузятая думка, што мэтавікі — гэта тыя, хто па агульным конкурсе не праходзіць. Насамрэч патрабаванні высокія: для ўдзелу ў конкурсе неабходны сярэдні бал не ніжэйшы за 7. Мы прааналізавалі склад абітурыентаў, і гэта маладыя людзі з баламі 9,1-9,2, часам — з 8. Гэта вельмі добра падрыхтаваныя абітурыенты, якія свядома ідуць у спецыяльнасць», — адзначыла Наталля Пяткевіч.

Віцэ-прэм'ер дадала, што конкурс на мэтавыя месцы высокі: па краіне іх у гэтым годзе больш за 6,6 тысячы, а суадносіны колькасці месцаў да колькасці пададзеных заяў — 1 да 10. Пры гэтым дзяржаўная камісія строга сочыць за выкананнем усіх працэдур і недапушчэннем парушэнняў. «Сёння заканадаўчыя падставы, якія створаны для мэтавікоў, даюць упэўненасць, што гэта будуць добра падрыхтаваныя спецыялісты. Абавязкова ўведзены конкурс. Калі няма конкурснай асновы, месца перадаецца для размеркавання на агульных падставах. Мэтавая падрыхтоўка — гэта падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў, нават, напэўна, больш вызначаных у сваім выбары», — падкрэсліла Наталля Пяткевіч.

Залічэнне мэтавікоў, якія прайшлі іспыт, адбудзецца 12 ліпеня.

Спецыялісты Міністэрства адукацыі расказалі, што экзамены праходзілі ў вуснай форме па першым профільным вучэбным прадмеце. Дарэчы, тым, хто будзе паступаць на мэтавае навучанне ў наступным годзе, важна разумець, што іх будзе чакаць не сумоўе, а менавіта экзамен. Выніковы конкурсны бал складзецца з выніку ўнутранага экзамену і сярэдняга бала атэстата або дыплома каледжа, які павінен быць не ніжэйшы за 7.

З 12 да 17 ліпеня будзе праходзіць прыём дакументаў у дзяржаўных установах вышэйшай адукацыі за кошт бюджэтных сродкаў і на платнай аснове. У гэтыя ж тэрміны могуць падаць дакументы і паступаць на выбраную спецыяльнасць на агульных падставах і мэтавікі, якія не прайшлі па конкурсе. На сёння ўстаноўлены наступныя кантрольныя лічбы прыёму на 2025/2026 навучальны год: усяго ВНУ Беларусі прымуць 48,3 тысячы студэнтаў, з іх 31,8 тысячы — на бюджэт і 16,5 тысячы — на платнае навучанне. Больш за ўсё бюджэтных месцаў атрымаюць інжынеры, педагогі, медыкі і аграрыі.

### АДОРАНЫЯ ДЗЕЦІ І «ПРОФІЛЬНІКІ»

Тры дні на падачу дакументаў — такі тэрмін вызначаны для выпускнікоў профільных класаў прафесійнай накіраванасці і для моладзі, якая асвоіла змест праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі ў перыяд знаходжання ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку. Прадстаўнікоў гэтых катэгорый чакаюць у прыёмных камісіях з 12 да 14 ліпеня. Нагадаем, што сёлета ў краіне адбыўся першы маштабны выпуск профільных інжынерных

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ — АДЗІНЫ ДЗЕНЬ ПРЫЁМУ

17 ліпеня ў Гомельскай вобласці адбудзецца адзіны дзень прыёму грамадзян членамі Савета Рэспублікі.

Прыёмы правядуць:

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Іванаўна КАЧАНАВА** — з 11.00 у Рагачоўскім райвыканкаме;

**старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзіслаў Вікенцьевіч ТАТАРЫНОВІЧ** — з 11.00 у адміністрацыі Навабеліцкага раёна г. Гомеля;

**старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Сяргей Міхайлавіч СІВЕЦ** — з 11.00 у Ельскім райвыканкаме;

**старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Леанід Канстанцінавіч ЗАЯЦ** — з 11.00 у Кармянскім райвыканкаме;

**старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Фёдаравіч АЛЕЙНІК** — з 11.00 у Рэчыцкім райвыканкаме;

**намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня праўлення ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк» Віктар Міхайлавіч АНАНІЧ** — з 10.00 у Акцябрскім райвыканкаме;

**намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар ААТ «Рассвет імя К. П. Арлоўскага» Аляксандр Іванавіч БАГЕЛЬ** — з 11.00 у Нараўлянскім райвыканкаме;

**намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Ігар Максімавіч БРЫЛЕВІЧ** — з 11.00 у Житкавіцкім райвыканкаме;

**намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, дырэктар — галоўны рэдактар установы «Выдавецкі дом «Беларусь сегодня» Дзмітрый Аляксандравіч ЖУК** — з 11.00 у Буда-Кашалёўскім райвыканкаме;

**член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар ААТ «Ціхінічы» Рагачоўскага раёна Юрый Уладзіміравіч ВАСІЛЬЦОЎ** — з 10.00 у Веткаўскім райвыканкаме;

**член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатольеўна ЗЕНКЕВІЧ** — з 10.00 у Хойніцкім райвыканкаме;

**член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня канцэрна «Белнафтахім» Ілья Валер'евіч ІКАН** — з 10.00 у Мазырскім райвыканкаме;

**член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага цэнтра Віктар Аляксандравіч КАНДРАТОВІЧ** — з 12.00 у Добрушскім райвыканкаме;

**член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, дырэктар Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» Аляксандр Аляксандравіч КАРКАТАДЗЭ** — з 11.00 у Петрыкаўскім райвыканкаме;

**член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр Сяргеевіч ЛУК'ЯНАЎ** — з 13.00 у Жлобінскім райвыканкаме;

**член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, генеральны дырэктар ААТ «Гомсельмаш» Аляксандр Аляксандравіч НОВІКАЎ** — з 10.00 у Лоеўскім райвыканкаме;

**член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Ксенія Аляксандраўна ПАНЦЮХОВА** — з 11.00 у Калінкавіцкім райвыканкаме;

**член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, дырэктар Інфармацыйнага агенцтва «Магілёўскія ведамасці» Ірына Іванаўна ПЕТРУСЕВІЧ** — з 11.00 у Светлагорскім райвыканкаме;

**член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар ААТ «Жураўлінае» Пружанскага раёна Аляксандр Іванавіч ПІШЧ** — з 13.00 у Лельчыцкім райвыканкаме;

**член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, генеральны дырэктар Гомельскага гандлёва-вытворчага РУП «Фармацыя» Людміла Анатольеўна САПЕГА** — з 11.00 у Брагінскім райвыканкаме;

**член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, генеральны дырэктар ААТ «Беларускі цэментны завод» Ігар Алегавіч СЯРГЕЕЎ** — з 11.00 у Чачэрскім райвыканкаме.

Падрабязны анонс з указаннем адрасоў раённых выканаўчых камітэтаў размешчаны на афіцыйным сайце Савета Рэспублікі (https://sovrep.gov.by).

# УСТУПНАЯ КАМПАНІЯ НОН-СТОП

## 10 ліпеня завяршыліся экзамены ў абітурыентаў, якія паступалі ў ВНУ на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі



класаў — тут навучаліся каля 2,5 тысячы юнакоў і дзяўчат.

Па словах прадстаўнікоў адукацыйнага ведамства, выпускнікі, якія дасягнулі высокіх вынікаў у вучобе — не ніжэй за восем балаў па профільных прадметах і не ніжэй за сем балаў па ўсіх астатніх, маюць права паступіць па сумоўі. Важная ўмова — наяўнасць рэкамендацый педагагічнага савета школы. У цэлым жа выдзелена пяць кірункаў, па якіх «профільнікі» могуць паступаць без экзаменаў: педагагічны, аграрны, ваенна-патрыятычны, спартыўна-педагагічны, інжынерны.

Як і летась, маладыя людзі, што засвоілі змест адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку, маюць магчымасць паступлення ў ВНУ без уступных іспытаў на шэраг запатрабаваных спецыяльнасцяў. Для гэтага выпускнікам неабходна атрымаць рэкамендацыю назіральнага савета тэхнапарка і прайсці сумоўе ва ўніверсітэце.

### ВОЧНІКІ І ЗАВОЧНІКІ

Некалькі падоўжаны, з 12 да 19 ліпеня, тэрмін падачы дакументаў на вочнай (дзённай) форме па кірунках адукацыі «Сельская гаспадарка», «Ветэрынарыя», «Рыбная гаспадарка» і «Ахова працы» (за кошт бюджэтных сродкаў і на платнай аснове) і па ўсіх спецыяльнасцях у Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь, Акадэміі МУС, Магілёўскім інстытуце МУС і Інстытуце пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь, а таксама на ваенных факультэтах.

### УСТУПНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ

18 ліпеня пачнуцца і 25-га скончацца ўступныя экзамены для абітурыентаў, якія паступаюць на агульных падставах, у тым ліку і на творчыя спецыяльнасці.

З 18 да 20 ліпеня пройдуць экзамены ва Універсітэце грамадзянскай абароны МНС.

З 20 да 21 ліпеня — экзаменацыйныя іспыты на ваенным факультэце Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.

З 20 да 25 ліпеня будуць экзаменаваць абітурыентаў, якія паступаюць на стацыянар у ВНУ на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці.

З 6 да 15 снежня пройдзе экзаменацыйная кампанія для тых, хто паступае на завочнае аддзяленне ўніверсітэтаў сельскагаспадарчага профілю.

Вызначаны, па словах спецыялістаў Мінадукацыі, і тэрміны правядзення дадатковага набору ў дзяржаўныя ВНУ на месцы, якія засталіся вакантнымі пасля залічэння абітурыентаў, — пры неабходнасці яго правядуць з 28 да 29 ліпеня.

### А ШТО З КАЛЕДЖАМІ І ЛІЦЭЯМІ?

У Мінадукацыі паведамілі, што колькасць мэтавых месцаў у ССНУ — 890, па 70 спецыяльнасцях. Тут найбольшы попыт на спецыялістаў у такіх сферах, як «Інжынерыя і інжынерная справа», «Лясная гаспадарка», «Архітэктура і будаўніцтва», «Эксплуатацыя і наладка аўтаматызаванага абсталявання машынабудаўнічай вытворчасці», «Мантаж і эксплуатацыя электраабсталявання». Папулярныя і спецыяльнасці па абслугоўванні і рамонце транспартных сродкаў.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота дадзена БДПУ.**

### НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПРА ДАКУМЕНТЫ! (пры паступленні на агульных умовах)

- пашпарт;
- заява на імя рэктара (запаўняецца на месцы або ў электронным кабінеце на сайце ВНУ);
- атэстат і (або) дыплом каледжа (арыгінал);
- сертыфікаты ЦЭ/ЦТ 2024-2025-га года;
- характарыстыка (для выпускнікоў 2025-га года);
- медыцынская даведка аб стане здароўя.

*Спіс дапаўняюць дакументы, якія пацвярджаюць права абітурыента на льготы пры паступленні (калі яны ёсць), а таксама фота памерам 3х4, канверт з маркай для перасылкі пісьмовай карэспандэнцыі па Беларусі.*

НОВАЕ ПАКАЛЕННЕ

# ПРЭЗЕНТАЦЫЯ КРАІНЫ — ПРАЗ ТАНЦЫ І ПЕСНІ

## На Міжнародным форуме «Дзеці Садружнасці» прайшоў Дзень Арменіі

У чацвер на X Міжнародным форуме «Дзеці Садружнасці», які сёлета Беларусь прымае ўпершыню, на сцэне Нацыянальнага дзіцячага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Зубраня» прайшоў Дзень Арменіі. Удзельнікі дэлегацыі расказалі пра культуру сваёй краіны, выступілі з нацыянальнымі танцамі і выканалі традыцыйныя мелодыі.

Вялікая культурна-адукацыйная праграма пачалася з раніцы. Гісторыю краіны і народа расказвалі і паказвалі ў тэатралізаваных сцэнках. Дзеці з энтузіязмам акунуліся ў атмасферу армянскіх танцаў, асвойваючы іх пад гучанне дудука і дхола. Юныя артысты з трапятаннем і павагай расказалі публіцы пра трагічныя старонкі гісторыі Арменіі, пра сілу духу армянскага народа, які перажыў мноства выпрабаванняў. Асаблівае месца ў пастаноўцы было адведзена ўнёску армянскіх салдат у Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне. Спектакль стаў данінай памяці героям, якія адстаялі мір на зямлі.

Пасля харэаграфічнай часткі ўдзельнікі форуму вывучалі армянскі алфавіт і пазнаёміліся з новымі словамі, паглыбляючыся ў моўную разнастайнасць. Завяршэннем стала выкананне армянскіх народных песень разам з прадстаўнікамі іншых дэлегацый.

**Удзельніца форуму Татавік Петрасян** прызналася: «Мы хацелі прадставіць армянскую культуру, асабліва яе ролю ў Вялікай Айчыннай вайне. Галоўная тэма форуму — 80-годдзе Вялікай Перамогі, і для нас гэта вельмі важная дата».

Дзяўчыне вельмі спадабалася сталіца Беларусі. Паводле яе слоў, Мінск — прыгожы, чысты, утульны горад. А тут, на Нарачы, уразіла вялізарная колькасць зеляніны і лясоў. «У Дзень Беларусі мне вельмі спадабаліся танцы і нацыянальныя касцюмы. Мы ўжо пасябравалі з дзецьмі з іншых краін, асабліва — з Беларусі. Усе вельмі гасцінныя і прыязныя. Знайсці агульную мову нашым народам сапраўды лёгка», — адзначыла яна.

Такія культурныя дні сталі неад'емнай часткай форуму. Яны дапамагаюць удзельнікам лепш даведацца пра гісторыю і традыцыі адно аднаго, убачыць, наколькі падобныя каштоўнасці і погляды ў народаў СНД, і адчуць сапраўднае сяброўства.

А ўвечары ў «Зубраняці» сваю краіну, яе культуру і традыцыі прадставілі ўдзельнікі з Казахстана.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота тэлеграм-канала «Дзеці Садружнасці 2025».**




# ДОПОЛНЕНИЯ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «НикаПроект»,

*опубликованной в газете «Звязда» 26.02.2021 г.*

по объекту: «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями на пересечении ул. Прилукской – ул. Глаголева – пр. Жукова» в г. Минске (3-я очередь строительства 3-7-я секции).

**Застройщик:** Общество с ограниченной ответственностью «НикаПроект», зарегистрированное в ЕГР 22.03.2011 за № 191581623.

**Место нахождения:** г. Минск, ул. М.Богдановича, д. 155, оф. 810, тел. +375 29 647 70 00.

**Характеристика объекта строительства:** Проектной документацией предусматривается строительство встроенного нежилого помещения общей площадью 28,67 кв. м, расположенного в 7-й секции на 1-м нежилом этаже с обособленным входом с дворовой территории с уровня земли.

Высота помещения составляет 3,510 метра. Встроенное помещение изолировано от жилой части дома глухими стенами и перегородками. Окна и входные двери – витражные из алюминиевых профилей с заполнением стеклопакетами. В качестве наружной отделки стен применяются навесной «вентилируемый фасад» с применением керамогранитных плит. Проектом предусмотрено создание безбарьерной среды, а также благоустройство территории в границах работ 3-ей очереди.

Встроенное помещение передается с черновой внутренней отделкой: штукатурка стен, стяжка пола. Система отопления встроенного помещения выполняется отдельно от системы отопления жилого дома, с установкой индивидуального прибора учета тепла. Отопление водяное, предусмотрена вертикальная и горизонтальная (в конструкции стяжки пола) разводка, отопительные приборы. Система вентиляции встроенного помещения – приточно-вытяжная механическая и частичная естественная вентиляция (приток) с механической вытяжкой. Водоснабжение встроенного помещения– от отдельной системы водопровода низкого давления с установкой индивидуальных приборов учета потребляемой воды, предусмотрена установка и подключение унитазов

Электроснабжение: предусмотрена установка вводно-распределительных щитков. От каждого вводно-распределительного щитка предусмотрено подключение оптического модема, системы вентиляции, щитка пожарной сигнализации, дополнительно предусмотрен резерв.

Общая суммарная выделенная электрическая мощность на помещения общественного назначения составляет 220 кВт. Проектом предусмотрена техническая возможность подключения потребителей 5-20 кВт в зависимости от площади помещения и его функционального назначения. Связь и сигнализация: установка оптического распределительного устройства для предоставления услуг связи РУП «Белтелеком». Встроенное помещение оборудуется автономной неадресной системой пожарной сигнализации и системой оповещения с выводом на пульт диспетчеризации МЧС. По соглашению сторон отдельные виды работ могут не выполняться.

**Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается офисное помещение по цене за 1 кв. м, эквивалентной 2200 долларов США.**

**Условия оплаты:**

- при условии единовременной оплаты стоимости объекта долевого строительства расчет должен быть произведен дольщиком в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном органе. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости объекта либо иные условия его оплаты.



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**РУП «Белоруснефть-Минскоблнефтепродукт»**
(Продавец).

**Электронные торги состоятся 13.08.2025.**

**Лот № 1:** Трактор (кат. В), модель Беларус – 3022ДЦ, идентификационный № 30200745.
Начальная цена без НДС – 80 700,00 руб.

**Лот № 2:** Трактор (кат. В), модель Беларус – 3022, идентификационный № 30201833.
Начальная цена без НДС – 80 700,00 руб.

**Лот № 3:** Зерноуборочный комбайн (кат. D), КЗС-1218-10, идентификационный № 03323.
Начальная цена без НДС – 42 300,00 руб.

**Лот № 4:** Жатка для грубостебельных культур ЖГР - 4,5, заводской № 507.
Начальная цена без НДС – 14 900,00 руб.

**Лот № 5:** Комплекс кормоуборочный КВК-800-36, заводской № 596.
Начальная цена без НДС – 36 200,00 руб.

**Лот № 6:** Подборщик КВС-4-3900000, заводской № 0489.
Начальная цена без НДС – 7 600,00 руб.

**Лот № 7:** Сеялка СПУ-6 МВ «Берестье», заводской номер 877.
Начальная цена без НДС – 9 800,00 руб.

**Место нахождение** Лотов №№ 1–3: Минский обл., Логойский р-н, аг. Гостиловичи; Лотов №№ 4–7: Минская область, Логойский район, аг. Гостиловичи, ул. Трудовая, 4.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52;**
**torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «БКО-резервуаркомплект», 220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62/13, пом. 1 |

**Предмет электронных торгов:**
**Производственно-складская база, реализуемая одним лотом** (инв. номера 710/С-54257, 710/С-54259, 710/С-54260, 710/С-54262, 710/С-54263, 710/С-54265, 710/С-54267, 710/С-54268, 710/С-54270, 710/С-59123, 710/С-59124, 710/С-59125, 710/С-59130, 710/С-62671).
**Месторасположение:** Могилевская обл., Бобруйский р-н, Ковалевский с/с, южнее д. Ковали (в районе ст. Телуша).
**Сведения о земельном участке с кадастровым номером 720882400001000005:** предоставлен на праве аренды по 04.03.2115 г. для размещения объектов промышленности (Земельный участок для содержания и обслуживания битумной базы) общей площадью 1,1960 га.
Подробный перечень капитальных строений и иного имущества, входящего в состав лота, размещен на сайте организатора аукциона ИПМ-Торги (www.ipmtorgi.by)

| | |
|---|---|
| **Начальная цена (без НДС)** | **29 000,00 бел. руб. (снижена на 55 %)** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB 30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **8 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 21.05.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 25.07.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **24.07.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных
электронных торгов по продаже имущества,
принадлежащего
**ОАО «Несвижский райагросервис»** (Продавец)
на праве собственности.

**Электронные торги состоятся 24.07.2025 в 10.00.**

**Лот № 1:**
Клуб с инв. № 621/С-1029051, 677,2 кв. м.

Земельный участок 624283505401000271 (0,5305 га).
Право аренды.
**Адрес:** Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, д. Саска Липка, ул. Юбилейная, 7.

Начальная цена – 81 192,00 руб. с учетом НДС 20 %.
Задаток – 8 119,20 руб.
Шаг электронных торгов – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **22.07.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182



Утерянное свидетельство о государственной регистрации Общества с ограниченной ответственностью «ГЕОНЕМА» (УНП/регистрационный номер 190437660) **считать недействительным.**



Свидетельство о государственной регистрации № 01-0094 и печать Барановичского городского отдела общественного объединения «Союз поляков на Беларуси» **считать недействительными в связи с утерей.** УНП 100697146


УРАДЖАЙ-2025

# НЕ БУДЗЕ ПРОСТЫМ СЁЛЕТА ЖНІВО

## Ячмень давядзецца ўбіраць адначасова з рапсам, чакаецца вялікая загрузка зернятокаў



Усе сілы беларускіх аграрыяў зараз мабілізаваныя на палі. У краіне набірае тэмп уборачная кампанія, і ўжо ёсць лідары жніва. Нават нягледзячы на няпростыя ўмовы надвор'я, ураджай прапасці не павінен. Якім будзе жніво-2025? І наколькі гатовыя сельгаспрадпрыемствы і аграрыі да свайго самага галоўнага экзамену? Адказы на гэтыя пытанні карэспандэнт «Звязды» шукаў на прыкладзе цэнтральнага рэгіёна краіны: доля Міншчыны, як вядома, у агульным хлебным каравае самая вялікая.

На пасяджэнні Мінскага аблвыканкама яго **старшыня Аляксей КУШНАРЭНКА** паставіў канкрэтныя задачы перад кіраўнікамі раёнаў: «Тэхніка павінна быць гатовая на 100 %. Калі яна зношаная і не можа выконваць свае функцыі, то неабходна спісваць. А калі яе можна адрамантаваць, то гэта трэба рабіць не ў апошні момант, а ў інтэрвал паміж кампаніямі, які ў нас ёсць. Я дапускаю, што любыя машыны могуць выйсці са страю, але неабходна прымаць меры».

Уборачная кампанія ў цэлым праверыцца на полі, заявіў старшыня **камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага аблвыканкама Сяргей ПРЫМАЧЭНКА**. Паводле яго слоў, жніво сёлета будзе вельмі складаным: «Таму важна на месцах дакладна планаваць работу і расстаўляць прыярытэты, каб не губляць каштоўны час».

Ён дадаў, што сёння на месцах усе кіраўнікі і адказныя асобы цалкам разумеюць, наколькі важная якасная падрыхтоўка да ўборачнай: «З улікам існуючых умоў надвор'я мы назіраем нераўнамернае пасяванне збожжавых культур па вобласці. Таксама ідзе напластаванне ўборкі азімага ячменю з уборкай азімага рапсу. З гэтым мы сутыкаемся ўпершыню, таму што сёння яшчэ масава не прыступілі да ўборкі азімага ячменю. Для параўнання — за аналагічны перыяд мінулага года мы ўбралі ўжо больш за 20 тысяч гектараў. Гэта сведчыць аб тым, што сёння вельмі важна расставіць прыярытэты: дзе ў першую чаргу неабходна жаць азімы ячмень, дзе ўбіраць рапс, а дзе — потым ужо — усе астатнія культуры: азімую пшаніцу, трыцікале і азімае жыта. Дарэчы, з улікам таго, што адначасова давядзецца ўбіраць і рапс, і ячмень, сёлета чакаецца высокая нагрузка на камбайн — у сярэднім яна складзе 313 гектараў на кожную адзінку тэхнікі».

Паводле слоў старшыні камітэта, сёлета ў вобласці купілі 66 камбайнаў. Усе яны будуць удзельнічаць ва ўборачнай кампаніі. А ўвогуле тут будуць задзейнічаны 1525 адзінак камбайнаў, а разам з імі — больш за 7 тысяч сельскагаспадарчых машын. Усе яны штодня будуць выходзіць у палі на разнапланавыя работы. Агульная ўборачная плошча збожжавых культур у вобласці — больш за 470 тысяч гектараў.

«Мы не ведаем, як у далейшым будуць складвацца ўмовы надвор'я, але разумеем, што сёлета, напэўна, будзе вельмі вялікая нагрузка на зернятокі. Нашы зернеачышчальныя комплексы павінны быць гатовыя як ніколі, каб своечасова і якасна перасушыць той аб'ём збожжа, які будзе да іх паступаць», — падкрэсліў старшыня камітэта. У цэлым для сушкі і ачысткі збожжа ў вобласці падрыхтавана 428 зернеачышчальна-сушыльных комплексаў. Іх прапускная здольнасць — 120 тысяч тон у суткі, што дастаткова нават пры пікавых нагрузках.

У цэнтральным рэгіёне таксама назапашаны вопыт па прыцягненні ў перыяд масавай уборкі дадатковых працоўных рэсурсаў. «Мы разумелі загадзя, што падчас уборкі спатрэбіцца як дадатковыя працоўныя рукі, так і тэхніка. Бо справіцца гаспадаркам без падтрымкі вельмі складана. У гэтым сезоне будзе задзейнічана каля 600 чалавек і амаль 270 адзінак тэхнікі. Гэта грузавыя машыны для адвозу збожжа, пагрузчыкі, спецтэхніка, без якой абысціся немагчыма», — рэзюмаваў Сяргей Прымачэнка

Што датычыцца астатніх відаў работ, сёння ў вобласці поўнамаштабна вядуць корманарыхтоўку. «Другі ўкос ужо ўбраны на плошчы больш за 100 тысяч гектараў. Плануем скончыць другі ўкос да масавай уборкі збожжавых. Для гэтага мы штодня нарыхтоўваем ад 40 тысяч тон сенажу. У цэлым ужо выйшлі на 2 мільёны 150 тысяч тон. Гэта работа будзе працягнута. Той недахоп, які атрымаўся з улікам вясновых замаразкаў па першым укосе, мы павінны кампенсаваць за кошт другога. Для гэтага ёсць усё неабходнае», — акцэнтаваў старшыня камітэта.

Адразу за жнівом — сяўба азімых. Сёлета аграрыі Мінскай вобласці ставяць перад сабой высокую планку — упершыню ў гісторыі пасеяць 400 тысяч гектараў азімых збожжавых культур. «Да збожжавых трэба яшчэ дадаць 115 тысяч гектараў азімага рапсу. Задача складаная, але аб'ектыўная. У нас назапашаны вопыт вырошчвання азімых, ёсць магчымасць набываць угнаенні. Зыходзячы з гэтага і фарміравалася плошча. Некаторыя раёны вобласці — Слуцкі, Капыльскі, Нясвіжскі — ужо выйшлі на 40 % азімых у агульнай структуры раллі і зразумелі, што з азімых збожжавых можна атрымліваць годныя ўраджаі. За пяць гадоў і па азімай пшаніцы, і па азімым ячмені мы бачым устойлівы плюс, таму сумневаў ні ў каго не ўзнікае — плошчы трэба павялічваць», — падкрэсліў Сяргей Прымачэнка.

Па стане на 10 ліпеня гатоўнасць камбайнаў да масавага жніва ў Мінскай вобласці складае 95 %. Цалкам гатова да прыёмкі зернесушыльная гаспадарка.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота БелТА.**

## Дарэчы



**Па даных Мінсельгасхарча на пачатак тыдня**, работнікі аграпрамысловага комплексу краіны ўбралі 20,5 тысячы гектараў азімага ячменю (больш за 8 % уборачных плошчаў), намалаціўшы 96,4 тысячы тон з ураджайнасцю 47,1 цэнтнера з гектара.

Разам са жнівом дынамічна рухаецца нарыхтоўка кармоў для жывёлы, у прыватнасці, фактычна завершаны першы ўкос траў.

Працягваюць гаспадаркі, акрамя таго, праводзіць вапнаванне кіслых глеб, паколькі даламітавая мука неабходная для нейтралізацыі залішняй кіслотнасці і падтрымання аптымальнага глебавага асяроддзя. Работы выкананы амаль на палове плошчаў ад плана.

СПАЖЫВЕЦ

# АНЛАЙН-ПЛЯЦОЎКІ Ў ЗАКОНЕ

## Што змянілася ў інтэрнэт-гандлі і куды звяртацца, каб адстаяць свае правы?



Пакупкі праз інтэрнэт з кожным годам становяцца ўсё больш распаўсюджанымі. На сёння іх доля ў аб'ёме рознічнага тавараабароту складае 11,7 % і пастаянна расце. На пачатак года ў нашай краіне зарэгістравана каля 31 тысячы інтэрнэт-магазінаў і інтэрнэт-пляцовак, і іх колькасць за апошнія пяць гадоў павялічылася ў 2,6 раза. Разам з ростам інтэрнэт-спажыўцоў павялічваецца і колькасць незадаволеных, напрыклад, тых, хто не змог вярнуць тавар, своечасова атрымаць назад свае грошы ці ўвогуле каму тавар даставілі, але па цане, якая раптам вырасла. Усе гэтыя пытанні ўрэгуляваны заканадаўствам, якое працягвае ўдасканальвацца. Напрыклад, з 11 ліпеня інтэрнэт-магазіны будуць абавязаны прымаць і адказваць на электронныя звароты пакупнікоў. Раней такія звароты прымаліся толькі ў пісьмовым выглядзе, што для пакупнікоў, пагадзіцеся, нязручна. Пра нюансы заканадаўства і моманты, калі «пакупнік заўсёды мае рацыю», расказала начальнік упраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Іна ГАЎРЫЛЬЧЫК.

### ТАВАР ДАСТАВІЛІ ПА БОЛЬШ ВЫСОКАЙ ЦАНЕ. ШТО РАБІЦЬ?

Трэба мець на ўвазе тое, што гарантыі ў спажыўцоў інтэрнэт-магазінаў тыя ж, што і ў спажыўцоў звычайных крам. У частцы абароны правоў спажыўцоў заканадаўства нашай краіны максімальна набліжана ў стацыянарным і анлайн-гандлі.

— Інтэрнэт-магазіны не ананімныя, заўсёды можна знайсці іх уладальнікаў, вынесці прадпісанне, каб былі ліквідаваны парушэнні. Акрамя таго, спажывец можа звярнуцца ў суд і абараніць свае правы там. Гэтыя меры дзейнічаюць дзякуючы Указу № 60 Прэзідэнта Беларусі, які быў прыняты даўно і вельмі эфектыўна працуе, асабліва ў частцы абароны правоў спажыўцоў, — адзначыла Іна Гаўрыльчык.

Часцей за ўсё ад пакупнікоў паступаюць скаргі на тое, што ў інтэрнэт-магазіне была заяўлена адна цана, а пры дастаўцы яна мяняецца, прычым часцей павышаецца.

— Бываюць збоі на інтэрнэт-рэсурсах, і тады відаць, што кошт тавару абсалютна нізкі ў параўнанні з рынкавым. Але гэта крайне рэдкія выпадкі. Часцей за ўсё здараецца так, што падчас заказу заяўлена адна цана, а калі яго дастаўляюць, ён падаражаў: мы не можам аддаць яго за 100 рублёў, а толькі за 120, — прыводзіць прыклад Іна Гаўрыльчык. — Вось гэта парушэнне заканадаўства (і такіх выпадкаў дастаткова шмат), бо дагавор на пакупку быў заключаны тады, калі быў прыняты заказ. І змяненне кошту — гэта істотнае змяненне дагавора, таму са спажыўцом гэта павінна быць узгоднена.

### КУДЫ ПІСАЦЬ ПРЭТЭНЗІЮ?

Год таму ў заканадаўства былі ўнесены некаторыя змяненні, у прыватнасці ўрэгуляваны такія паняцці, як інтэрнэт-магазін (гэта адзін прадавец тавару) і інтэрнэт-пляцоўка (дзе два і больш прадаўцы). У чыстым выглядзе інтэрнэт-пляцоўка не з'яўлялася да нядаўняга часу суб'ектам ва ўзаемаадносінах са спажыўцом.

— У нас былі такія ўзаемаадносіны: спажывец — прадавец інтэрнэт-гандлю. Але пляцоўка — гэта таксама рэсурс, які аказвае спажывецкія паслугі, дае інфармацыю аб характарыстыках тавараў і аб прадаўцах, кошце і дастаўцы, — растлумачыла Іна Гаўрыльчык. — Такім чынам, калі прадаўца пэўнай інтэрнэт-пляцоўкі пакупнік знайсці не можа, ён можа звярнуцца да самой інтэрнэт-пляцоўкі, дзе павінны садзейнічаць у абароне правоў спажыўца, напрыклад, дапамагчы вярнуць тавар і грошы за яго.

Акрамя таго, з'явілася і азначэнне пункта выдачы заказаў. Тут трэба ўсведамляць, што гэта не гандлёвы аб'ект, адпаведна кнігі скаргаў і прапаноў у ім можа і не быць. Спажыўцы нярэдка пры ўзнікненні спрэчных пытанняў імкнуцца яе патрабаваць. Куды ж звяртацца ў такім выпадку? На сам маркетплэйс, прычым ехаць нікуды не давядзецца. З 11 ліпеня ўступаюць у дзеянне нормы, якія прадугледжваюць абавязак інтэрнэт-пляцовак і інтэрнэт-магазінаў адказваць на электронныя звароты спажыўцоў у вызначаны заканадаўствам тэрмін. На сайце павінна прысутнічаць і інфармацыя пра асобу, якая адказвае за работу са зваротамі грамадзян. Да гэтага часу такога абавязку не было, адпаведна не заўсёды была арганізавана магчымасць адправіць электронны зварот, а шанцы атрымаць адказ былі ўяўнымі.

— Шмат было скаргаў і на чат-боты інтэрнэт-магазінаў, якія ветліва адказвалі ў стылі «мы працуем над вырашэннем вашай праблемы», аднак ні слова па сутнасці гэтай праблемы спажывец не атрымліваў. Цяпер з'явілася абавязацельства адказваць дакладна, — дадала Іна Гаўрыльчык.

### КАЛІ МАРКЕТПЛЭЙС НЕ ВЯРТАЕ ГРОШЫ, ПАТРАБУЙЦЕ НЯЎСТОЙКУ

Летась ад інтэрнэт-спажыўцоў атрымана амаль 11 тысяч зваротаў, што на 7 % больш, чым у 2023-м. У выніку разбіральніцтваў пакупнікам вернута 1626 тысяч рублёў, анлайн-гандлярам вынесена 293 прадпісанні, складзены 231 пратакол па прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці, у суд накіраваны 161 іск па абароне правоў спажыўцоў.

Самымі распаўсюджанымі парушэннямі інтэрнэт-магазінаў з'яўляецца няпоўная інфармацыя пра тавар, якая паўплывала на выбар, адмова прадаўца прымаць тавар з недахопам, невыкананне тэрмінаў вяртання грошай. Напрыклад, часта пакупнікі чуюць, што 14 дзён мінула, таму няякасны тавар прадавец прымаць адмаўляецца. Аднак цягам 14 дзён прадавец павінен прыняць тавар належнай якасці. А вось вярнуць няякасны можна цягам двух гадоў. Таксама вам не могуць адмовіць пры вяртанні няякаснага тавару, калі ў вас няма яго каробкі ці ўпакоўкі. Патрабаванні да ўпакоўкі распаўсюджваюцца толькі на вяртанне цягам 14 дзён тавару належнай якасці.

Аднак часцей за ўсё інтэрнэт-пляцоўкі не прытрымліваюцца тэрмінаў вяртання грашовых сродкаў.

— Калі тавар прыняты ў пункце выдачы заказаў, грошы павінны вярнуць у сямідзённы тэрмін. Тут ёсць добры механізм, які абараняе правы спажыўцоў. Калі парушаны тэрміны вяртання, можна патрабаваць няўстойку ў памеры 1 % за кожны дзень пратэрміноўкі, — кажа Іна Гаўрыльчык. — Калі гэта дарагі тавар, няўстойка будзе цалкам уражальнай. Некаторыя інтэрнэт-прадаўцы думаюць, што спажыўцы пра гэту норму не ведаюць, і вяртаюць толькі кошт тавару ці цягнуць з вяртаннем сродкаў. Тут спажыўцу нялішнім будзе нагадаць пра няўстойку, гэта звычайна працвярэжвае і паскарае прадаўцоў.

**Алена КРАВЕЦ.**


**ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «РЕТОРСИЯ ТРЕЙД»,**

***опубликованной в газете «Звязда» от 17.05.2025 г.,***

по объекту «Строительство жилого района с объектами инженерно-транспортной инфраструктуры в районе д. Тарасово Ждановичского с/с Минского района минской области».

**Жилой дом № 1 по ГП.**

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме № 1 по генплану предлагаются:

**4 (четыре)** однокомнатные квартиры **площадью 34–35 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 151 до 5 503 белорусских рублей;**

**4 (четыре)** однокомнатные квартиры **площадью 40–44 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 000 до 5 351 белорусских рублей;**

**2 (две)** двухкомнатные квартиры **площадью 53–54 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 4 818 до 5 169 белорусских рублей**;

**8 (восемь)** двухкомнатных квартир **площадью 62–64 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 4 394 до 4 836 белорусских рублей;**

**2 (две)** двухкомнатные квартиры **площадью 81–82 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 4 303 до 4 594 белорусских рублей.**

В организации действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося объекта.

Оплата производится в белорусских рублях. Указанные цены действуют до момента опубликования новой проектной декларации, дополнения или изменения к ней и при условии наличия квартир, предложенных для заключения по договорам создания объектов долевого строительства.

**Условия оплаты квартиры** – полная оплата цены договора в течение 3-7 рабочих дней либо поэтапная оплата цены договора в соответствии с действующей в организации системой рассрочки платежей с даты регистрации договора в местном исполнительном распорядительном органе.

Ознакомиться с планировками квартир можно по предварительной записи в офисе продаж «Гранд Вилладж» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567 по графику пн-пт с 9.00 до 18.00, сб, вс – выходные либо на сайте grand-village.by. Тел. офиса продаж +375 (29) 177-00-22.

Приём заявлений на участие в долевом строительстве будет осуществляться в порядке живой очереди с 9.00 14.07.2025 г.

УНП 691310944



ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 8 017 516 80 64) по поручению **ГУ «Стародорожский районный центр по обеспечению деятельности бюджетных организаций»** (222932, г. Старые Дороги, ул. Пролетарская, д. 38)

проводит открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1: автобус MAZ 241000, 2013 г. в., кузов (VIN) Y3M241000D0000060, регистрационный знак АН 3279-5, цвет – желтый), находящийся по адресу: Минская область, г. Старые Дороги, ул. Чапаева, 26.**

**Начальная цена** (без НДС) – **9 633,40** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **963,00** бел. руб.

**Стоимость снижена на 80 %.**

**Лот № 2: автобус MAZ 241S00, 2014 г. в., кузов (VIN) Y3M241S00E0000195, регистрационный знак АО 2470-5, цвет – желтый), находящийся по адресу: Минская область, г. Старые Дороги, ул. Чапаева, 26.**

**Начальная цена** (без НДС) – **10 766,60** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **1 076,00** бел. руб.

**Стоимость снижена на 80 %.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 07.09.2024, 30.10.2024, 13.02.2025.

Электронные торги состоятся **25.07.2025** в **10.00**.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.07.2025** до **17.00**.

**Тел.: (8017) 516-80-64, (8029) 136-31-11, (8044) 789-10-18.**
**Тел. для осмотра (8029) 396-55-40.**

УНП 690727164



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
информирует о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги»** на праве хозяйственного ведения (Продавец).

**Электронные торги состоятся 13.08.2025 в 10.00**

**Лот № 1:**

Машина коммунально-строительная многоцелевая МКСМ-1000Н.

Местонахождение: г. Гродно, парк Полесский, 3/1.

**Начальная цена без НДС** – 22 400,00 руб.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «АСБ Лизинг» (филиал «АСБ Логистик»), 202128, Минская область, Воложинский район, аг. Раков, ул. Радошковичская, 77. УНП 601082389 |

**Предмет электронных торгов:**

| № лота | Наименование | Начальная цена, с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Платная автостоянка № 4** (Сооружение многофункциональное), инв. № 600/С-140105, общ. пл. 15 460,0 кв. м, по адресу – Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район аг. Озерцо. *Сведения о земельном участке:* общ. пл. 1,9656 га предоставлен продавцу для обслуживания платной автостоянки № 4 на праве аренды по 23.06.2046 | 1 605 000,00 |
| 2 | **Электрический перевозчик паллет** BT LWE 160 levio, 2012 г. в. № 6189902 (3001) | 765,00 |
| 3 | **Электрический перевозчик паллет** BT LWE 160 levio серийный (зав) № 6212099 2012 г. | 765,00 |
| 4 | **Электроштабелер Ричтрак** BT RRE 140M Reflex 1753-5, 2012 г. в. № 6220176 (03952) | 3 170,00 |
| 5 | **Электроштабелер Ричтрак** BT RRE 140M Reflex 1753-84, 2012 г. в. № 6219305 (03934) | 3 550,00 |
| 6 | **Электроштабелер Ричтрак** BT RRE 140M Reflex 1753-84, 2012 г. в. № 6219306 (03936) | 3 170,00 |
| 7 | **Электрическая тележка** BT LWE 160 серийный (заводской) № 6212105 | 820,00 |

**Задаток 5 %** от начальной цены лота № 1 и **10 %** от начальной цены лотов №№ 2–7 перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата полной стоимости объекта должна быть произведена в течение **10 (десяти) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **2-10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Извещение о проведении предыдущих электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 17.06.2025 г. (лот № 1), 04.06.2025 г. (лоты №№ 2–7)

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**:
**25.07.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **24.07.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона)
по поручению **ОАО «Мирополье»** (продавец)
проводит открытый аукцион

## ПО ПРОДАЖЕ **МАГАЗИНА № 1**

**с инв. № 610/С-65558 общей площадью 94,1 кв.м**
**(составные части и принадлежности: магазин, 3 пристройки, уборная, сарай), расположенного на земельном участке с кадастровым номером 620850100001003259 площадью 0,0364 га (право аренды по 07.01.2074) по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. Лопатина, 179А.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона р. Березина (0,0364 га), охранная зона объектов газораспределительной системы (0,0010 га).*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 163 647,02** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 16 364,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **18.08.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.08.2025** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017)516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: 8 (029) 6677224.**

УНН 600134365

ЖЫЛЛЁ

# ДОМ, ЯКІ «ДЫХАЕ» ЛЕСАМ

## Больш за 30 лясгасаў сёлета будуць выраблящь драўляныя домакамплекты

Усё пачалося з ідэі. У свой час Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што галоўнае багацце нашых лясоў — драўніна — выкарыстоўваецца ў эканоміцы не так эфектыўна, як хацелася б. Акрамя таго, кіраўніком дзяржавы была пастаўлена задача адрадзіць драўлянае домабудаванне. Мінлясгас падхапіў гэту ініцыятыву.

### СЕТКА ПЛЯЦОВАК

У краіне створана сетка з 19 фірменных гандлёвых пляцовак пад брэндам «Лясны домік», расказаў **начальнік упраўлення вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі Міністэрства лясной гаспадаркі Андрэй МАЦКЕВІЧ.** «Галоўным чынам яны знаходзяцца ў абласных гарадах. Асноўная наша мэта — быць даступнымі, быць побач, каб любы жыхар нашай краіны змог прыехаць, заказаць неабходныя піламатэрыялы (у нас арганізавана дастаўка), павезці іх у тое месца, дзе ў яго знаходзіцца аб'ект будаўніцтва», — паведаміў ён.

Разам з тым спецыяліст нагадаў, што 23 лістапада 2020 года быў падпісаны Указ № 437 «Аб вядзенні лясной гаспадаркі і рэалізацыі драўніны». А 13 жніўня 2024 года Указам № 323 у папярэдні былі ўнесены змены. Дакументы выдадзены з мэтай задавальнення патрэб грамадзян у драўнянай сыравіне па прымальных цэнах і стымулявання насельніцтва да набыцця драўляных домакамплектаў для будаўніцтва жылля.

Андрэй Мацкевіч адзначыў: з моманту падпісання ўказа попыт на драўніну ў круглым выглядзе для будаўнічых патрэб значна вырас.Так, калі за 2023 год амаль 5 тысяч спажыўцоў лесу звярнуліся ў лясгасы і атрымалі каля 100 тысяч кубічных метраў драўніны, за мінулы год — ужо каля 6,5 тысячы кліентаў выпісалі каля 130 тысяч «кубоў» лесу. Сёлета ўжо афармлена больш за 5 тысяч такіх заявак, па якіх было адпушчана 103 тысячы «кубоў».

### НЕ ПРОСТА МАРА

Драўляны дом — мара, якая яшчэ нядаўна многім беларусам была не па кішэні. Цяпер усё змянілася. Закон аб рэалізацыі драўніны па льготных цэнах эканоміць не толькі грошы беларусаў, але і не менш каштоўны для будоўлі рэсурс — час.

Андрэй Мацкевіч звярнуў увагу, як штогод расце попыт і на домакамплекты. Такая вытворчасць працуе і ў Стаўбцоўскім раёне. На ўчастку «Акінчыцы» Стаўбцоўскага вопытнага лясгаса распрацаваны праект драўлянага домакамплекта ў чатырох варыянтах. Кошт гатовага праекта складае прыкладна ад 20 да 28,5 тысячы рублёў.

«Рэалізацыя ідзе з прыцягненнем праграмы спажывецкага крэдытавання «На родныя тавары». У мінулым годзе было прададзена тры домакамплекты, а сёлета — ужо чатыры, два з якіх — па праграме льготнага крэдытавання, — расказаў **намеснік дырэктара — галоўны інжынер Стаўбцоўскага лясгаса Генадзь ШПІЛЕЎСКІ.**

У нашай краіне створаны 25 вытворчых ліній па драўляным домабудаванні. Закуплена абсталяванне яшчэ для сямі. Кіраўніцтва Мінлясгаса літаральна ўпэўнена, што да канца года ўжо 32 лясгасы будуць выраблящь «канструктар» драўлянага жылля.



### БЕЗ ЛІШНІХ ВЫДАТКАЎ І ЗАТРЫМАК

Як атрымаць дзяржаўную падтрымку на дом мары, прадстаўнікі Мінлясгаса прадэманстравалі на прыкладзе Стаўбцоўскага раёна. Большую частку райцэнтра займае прыватная жылая забудова. Таму попыт на будаўнічыя матэрыялы тут высокі. Як адзначыў **галоўны ляснічы Стаўбцоўскага лясгаса Віктар БАБКО,** сёлета арганізацыяй на льготных умовах насельніцтву рэалізавана каля 1,8 тысячы «кубоў» драўніны.

Купля драўніны на льготных умовах абыдзецца ў Стаўбцоўскім раёне ў сярэднім каля 56 рублёў за «куб». Пры закупцы ў іншых арганізацыях кошт вырасце амаль утрая. Звярнуцца ў лясгас па льготную драўніну можа кожны. Але ёсць нюанс.

Будматэрыялы не выпісваюцца ў неабмежаванай колькасці. Для куплі лесу на льготных умовах неабходна звярнуцца з праектна-каштарыснай дакументацыяй у райвыканкам. Зыходзячы з праекта, вылічваецца неабходная для будаўніцтва або рамонту колькасць драўніны. Ужо з атрыманым рашэннем неабходна звярнуцца ў лясгас для куплі будсыравіны. Дакумент адкрыў новае акно магчымасцяў: у лясгасе цяпер можна купіць па цэнах, ніжэйшых за рынкавыя, да 70 кубаметраў круглага лесу для будаўніцтва і да 10 «кубоў» — для бягучага рамонту.

Пакупніку неабходна запоўніць заяўку. У ёй паказаць мэту набыцця драўніны і неабходны аб'ём. Калі чалавек выконвае ўсю працэдуру, дае неабходны пакет дакументаў, то лясгасы задавальняюць заяўкі ў поўным аб'ёме і на працягу некалькіх дзён. Яшчэ адзін важны нюанс — пакупнік да 1 лістапада года, у якім набыў драўніну, павінен падаць у лясгас справаздачу аб мэтавым выкарыстанні матэрыялу або інфармацыю, дзе тлумачыцца немагчымасць зрабіць гэта.

### РЭАЛЬНАЯ ЭКАНОМІЯ

Актыўна будаўніцтва прыватных жылых дамоў ідзе ў Стоўбцах у мікраараёне «Паўночны». Участак тут у 2021 годзе атрымала і шматдзетная сям'я Лаўрыновічаў. Драўняныя матэрыялы для будоўлі дома закупілі на льготных умовах. «Мы засталіся вельмі задаволеныя і вынікам, і якасцю, а таксама — коштам. З выкарыстаннем набытай драўніны змаглі пабудаваць дахавую сістэму, бэлькі, столь. У нас яшчэ засталіся матэрыялы і на гаспадарчыя пабудовы», — расказала Таццяна Лаўрыновіч.

Магчымасцю льготнай куплі драўніны скарысталася і сям'я Новікаў. На будаўніцтва дома муж і жонка вырашыліся, калі сталі шматдзетнымі бацькамі. «Для будоўлі нам прапанавалі круглы лес. Ён абыдзецца танней, чым гатовы. З набытых матэрыялаў будзем класці дах. Вядома, асобная цана выйдзе за спіл. Але ў любым выпадку меншая, чым за куплю гатовых матэрыялаў без ільгот. Так, па нашых разліках, мы сэканомілі каля 5 тысяч рублёў, — падзялілася Ірына Новік.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*Мінск — Стоўбцы — Мінск.*

СТЫХІЯ

# НЕПАГАДЗЬ НАРАБІЛА БЯДЫ

## У ноч на 10 ліпеня ў выніку праходжання па Беларусі навальнічнага фронту найбольш пацярпелі Віцебская і Магілёўская вобласці

Менш за дзве гадзіны спатрэбілася стыхіі, каб перакрыць дарогі і вуліцы паваленымі дрэвамі, парушыць электра- і водазабеспячэнне населеных пунктаў, сарваць дахі з дамоў...



Фота БелТА.

### БЯССОННАЯ НОЧ

Згодна з аператыўнымі данымі, на Магілёўшчыне першыя сур'ёзныя пашкоджанні інфраструктуры былі зафіксаваны ў 1.50 ночы. Ужо а другой гадзіне **Магілёўскае абласное УМНС**, па словах яго **начальніка Дзмітрыя ГОЛУБЕВА**, перайшло на ўзмоцнены варыянт нясення службы. «Усе людзі выйшлі, уся рэзервовая тэхніка была прыведзена ў баявы разлік», — расказаў ён.

У эпіцэнтры шквалістага ветру, які дасягаў 23 метраў у секунду, апынуліся Магілёў, Магілёўскі, Чавускі і Шклоўскі раёны. У выніку адключэння чатырох высакавольтных ліній адбыўся аварыйны прыпынак двух паравых катлоў і турбагенератараў філіяла «Магілёўская ЦЭЦ-2» РУП «Магілёўэнерга». У 5.45 раніцы работа ЦЭЦ была адноўлена, запушчана падача пары, паведамляе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. На тэрыторыі ААТ «Магілёўхімвалакно» ўпала металічная труба ўстаноўкі спальвання адходаў цэха. У выніку падзення пашкоджана сцяна будынка корпуса водападрыхтоўкі.

«У тры гадзіны аб'явілі аб зборы штаба (камісіі па надзвычайных сітуацыях пры Магілёўскім гарвыканкаме. — **«Зв.»**), а чацвёртай ён сабраўся, адпрацаваў усе моманты», — паведаміў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА** тэлерадыёкампаніі «Магілёў». Па яго словах, на раніцу чацвярга электразабеспячэнне ў абласным цэнтры ўжо было адноўлена — недзе на пастаяннай аснове, недзе — праз часовую сістэму.

Самай складанай сітуацыяй губернатар назваў аварыю на ЦЭЦ-2, куды раніцай чацвярга ўжо везлі новыя апоры. «Найбольш крытычная сітуацыя ў нас па «Хімвалакне», але там своечасова прыняты ўсе меры, і на сёння аднаўляем вытворчасць. Астатнія вытворчасці працуюць у штатным рэжыме, грубых парушэнняў няма, — паведаміў кіраўнік рэгіёна. — Што датычыцца сістэмы аховы здароўя, працуюць усе бальніцы, паліклінікі. Дзе адбыліся абрывы, былі запушчаны часовая схема (электразабеспячэння. — **«Зв.»**), дызель-генератары. Але сёння аднавілі і ўсё працуе па пастаяннай схеме».

Раніцай чацвярга не ўсе дзіцячыя садкі Магілёва змаглі прыгатаваць дзецям гарачыя сняданкі, пра што бацькі былі папярэджаны, і выхад з гэтай сітуацыі таксама знайшлі.

Галоўнай задачай на чацвер старшыня аблвыканкама назваў прывядзенне ў парадак асноўных вуліц Магілёва, каб па іх пайшоў транспарт. «Па ўсіх напрамках вядуцца работы, — сказаў Анатоль Ісачанка. — Акрамя таго, будзем прыцягваць дадатковыя рэсурсы: лясгасы, горад Бабруйск, які не пацярпеў».

### ДАПАМОГА З УСЁЙ КРАІНЫ

**Міністр па надзвычайных сітуацыях Вадзім СІНЯЎСКІ** раніцай 10 ліпеня заслухаў даклады кіраўнікоў Віцебскага і Магілёўскага абласных упраўленняў МНС аб арганізацыі работы тэрытарыяльных камісій па надзвычайных сітуацыях і даў указанні па рэалізацыі дадатковых мер па аказанні дапамогі людзям, якія пацярпелі ад непагадзі, і аператыўным ліквідаванні наступстваў праходжання навальнічнага фронту.

Віцебшчыну ўраган накрыў раней — увечары 9 ліпеня. Там пацярпелі населеныя пункты Гарадоцкага раёна. Цягам гадзіны былі пашкоджаны дахі 27 жылых дамоў, 17 гаспадарчых пабудоў, двух магазінаў і аднаго адміністрацыйнага будынка ў аграгарадку Вархі, пяці жылых дамоў і чатырох гаспадарчых пабудоў у вёсцы Прудок. Зафіксаваны 105 выпадкаў падзення дрэў, у выніку чаго пашкоджаны два аўтамабілі, перакрываўся рух у абодвух напрамках на ўчастках аўтадарог М8 і Н-2512. У той жа вечар яны былі адноўлены. З-за пашкоджання кантактнай лініі затрымка ў руху аднаго пасажырскага цягніка склала 1 гадзіну 17 хвілін.

Абласнымі службамі Віцебшчыны каардынуюцца работы ў зоне надзвычайнай сітуацыі, накіраваныя сілы і сродкі з іншых рэгіёнаў на аказанне дапамогі грамадзянам, аднаўленне дахаў. «Маецца адпаведны будаўнічы матэрыял, таксама рэалізуецца шэраг мерапрыемстваў па дастаўцы прадуктаў харчавання, па вывучэнні праблемных пытанняў грамадзян непасрэдна ў іх домаўладаннях, на прыдамавых тэрыторыях», — запэўніў **начальнік Віцебскага абласнога УМНС Сяргей МЯЛЕШКІН.**

Для ліквідацыі наступстваў стыхіі задзейнічаны 42 адзінкі тэхнікі МНС і 166 ратавальнікаў.

Па стане на 10 ліпеня работы па ўстараненні наступстваў стыхіі працягваліся ў 50 населеных пунктах краіны. Найбольш складаная абстаноўка застаецца ў Магілёўскім рэгіёне і горадзе Магілёве. Штармавы вецер прывёў да шматлікіх завалаў, якія ўскладнілі доступ да аб'ектаў. Энергетыкі разам з камунальнымі службамі, МНС і іншымі арганізацыямі расчышчалі дарогі.

«Над аднаўленнем электразабеспячэння працуюць 58 аварыйных брыгад і 54 адзінкі спецтэхнікі, — паведаміла Мінэнерга. — Дапамогу аказваюць брыгады з усіх рэгіёнаў краіны. Дадаткова накіраваныя яшчэ 45 брыгад, аснашчаных усёй неабходнай тэхнікай. Прыцягнуты будаўніча-мантажны комплекс энергасістэмы. Часовае электразабеспячэнне ажыццяўляецца з дапамогай 9 дызель-генератарных установак».

Па ўказанні Міністра ўнутраных спраў Івана Кубракова для ліквідацыі наступстваў стыхіі на Магілёўшчыне выдзелены ваеннаслужачыя ўнутраных войскаў МУС і супрацоўнікі органаў унутраных спраў. Таксама на ўчастках дарог, якія пацярпелі, задзейнічаны экіпажы ДАІ.

Да ліквідацыі завалаў падключыліся арганізацыі і насельніцтва. Па папярэдніх даных, ад начнога ўрагану на Магілёўшчыне пацярпела 1500 га ляснога фонду суцэльнымі санітарнымі рубкамі. У Магілёўскім лясгасе — 1240 га, Быхаўскім — 240 га, Чавускім — 20 га. Вецер нанёс шкоду і лясам Віцебшчыны.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

### ТРАГЕДЫЯ Ў МАГІЛЁВЕ

У выніку падзення дрэў загінула 32-гадовая жанчына і пацярпелі чатыры чалавекі, у іх ліку дзіця 2010 года нараджэння.

Следчыя высвятляюць абставіны гібелі жанчыны, паведаміў Следчы камітэт Беларусі. Трагедыя здарылася каля двух гадзін ночы ў раёне рачнога порта на рацэ Днепр. Па папярэдніх даных, жыхарка абласнога цэнтра разам з мужам напярэдадні ўвечары прыехала на рыбалку. Падчас непагадзі сужэнцы накрыліся пледам і схаваліся пад дрэвам. Моцны вецер паваліў дрэва на іх. Калі ратавальнікі вызвалілі пацярпелую, яна была без памяці. Пасля правядзення рэанімацыйных мерапрыемстваў медыкі канстатавалі яе смерць.

НАДВОР'Е

# ЗАЛЕВЫ І ШКВАЛІСТЫ ВЕЦЕР

## Месцамі прыпячэ да 31 °С

Ужо традыцыйна ў другі месяц лета на нашу краіну насоўваецца хваля максімальнага цяпла. Напрыканцы гэтага тыдня спякота будзе суправаджацца моцным парывістым ветрам, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы, месцамі пройдуць моцныя ліўні. У дзённыя гадзіны ў асобных раёнах град. Вецер пераменных напрамкаў парывісты, пры навальніцах месцамі шквалістае ўзмацненне ветру. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 12 да 18 °С, а па паўночным усходзе Беларусі — да 21 °С. Днём ад 15 °С па паўднёвым захадзе да 31 °С па паўночным усходзе краіны.

Ветрана будзе і ў суботу. Месцамі па краіне кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер пераменных напрамкаў умераны, месцамі парывісты, удзень пры навальніцах моцны. Тэмпература паветра ўначы ад 7 да 14 °С, а днём будзе ад 18 °С па захадзе да 27 °С па ўсходзе краіны.

У нядзелю зноў пройдуць кароткачасовыя дажджы, днём у асобных раёнах чакаюцца навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман. Вецер пераменных напрамкаў умераны, месцамі парывісты, удзень пры навальніцах моцны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 9 да 15 °С, днём — 22—29 °С.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона)
по поручению **ОАО «Мирополье»** (продавец)
проводит открытый аукцион

## ПО ПРОДАЖЕ **ЗЕРНОСКЛАДА**

**с инвентарным номером № 610/С-66006 общей площадью 3 889,8 кв. м,**
**расположенного на земельном участке с кадастровым номером 620887400001000881 площадью 1,4900 га по адресу: Минская область, Борисовский район, Пригородный с/с, 64 вблизи деревни Житьково.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, пл. 1,49 га, охранная зоеа электрических сетей, пл. 0,1314 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 33 218,72** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 3 321,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 80 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» 07.02.2025, 24.04.2025.

Аукцион состоится **23.07.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.07.2025** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: 8 (0177) 79-13-01, 8 (029) 667-72-24.**

УНН 600134365

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона)
по поручению **ОАО «Деревное»** (продавец)
проводит открытый аукцион

## ПО ПРОДАЖЕ **ЖИЛОГО ДОМА**

**с инв. № 622/С-47840 общ. пл. 78,5 кв. м,**
**расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625485802101000062 площадью 0,0732 га (право постоянного пользования), по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, Деревнянский с/с, д. Хотовка, ул. Центральная, 8А.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона линий линии электропередачи до 1000 вольт, пл. 0,0023 га.*

Начальная цена (без НДС) **– 50 775,89** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 5 077,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **14.08.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.08.2025** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (8017) 175-82-98, (8017) 175-82-17.**

УНН 600014473

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 8 017 516 80 64)
по поручению **государственного учреждения «Молодечненский межотраслевой центр обеспечения деятельности бюджетных организаций»**
(222310, г. Молодечно, ул. Я. Ясинского, 21),
в интересах Радошковичского сельского исполнительного комитета, проводит открытый аукцион

## ПО ПРОДАЖЕ **ЛЕГКОВОГО АВТОМОБИЛЯ**

**(внедорожника универсала) CHEVROLET NIVA, 2016 г. в., кузов (VIN) X9L212300G0609645, цвет – черно-синий,**
**находящегося по адресу: Минская область, Молодечненский район, г.п. Радошковичи, ул. Гастелло, 20.**

**Начальная цена** (без НДС) – **13 600,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 360,00** бел. руб.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Электронные торги состоятся **13.08.2025** в **10.00**.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.08.2025** до **17.00.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра транспорта: (8029) 575-75-87, время осмотра с 9.00 до 17.00 понедельник – пятница.**

УНП 692245892



# КВАС І ЯГО «ТАВАРЫШЫ»



## Чаму б імпартазамяшчэнню не дадаць нацыянальных адценняў?

**А ці не занадта мы захапіліся імпартазамяшчэннем?! Настолькі, што ўдарыліся ў капіраванне замежных прадуктаў, рэцэптур, назваў. Фета, пармезан, мацарэла, данаблю, ракфорці... І вытворцы ганарацца: нашы сыры нічым не горшыя, чым французскія, італьянскія, дацкія. Спаборнічаем з майстрамі з іншых краін: Расіі, Арменіі, Бразіліі. Нярэдка выйграём. Але ў чым доблесць? Копія, якой бы арыгінальнай ні была, заўжды саступіць арыгіналу. Самае парадаксальнае, што праз імпартазамяшчэнне мы сваімі рукамі, уласна кажучы, прасунулі замежныя брэнды на сваім жа рынку. У чым сэнс? А дзе нашы, беларускія нацыянальныя лінейкі? Мы ж малочная краіна. Ці не больш лагічна фарміраваць уласную кулінарную культуру? Са сваімі традыцыямі, сакрэтамі, брэндамі, прывязанымі да нашай роднай зямлі?**

Не хачу нікога пакрыўдзіць, але імпартазамяшчэнне — не самая складаная задача ў бізнесе. Ёсць прадукт, вядомыя яго характарыстыкі, смакавыя якасці. Рэцэптуру, тэхналогію вытворчасці звычайна трымаюць у сакрэце. Часта вытворцы арыгінальных прадуктаў заяўляюць, што ў іх ёсць нейкія зусім непаўторныя інгрэдыенты, вядомыя толькі вузкаму колу дасведчаных спецыялістаў. Або ўсімі сіламі прывязваюць прадукт да геаграфічнай мясцовасці. Асабліва моцныя ў гэтым вінаробы, назвы вінаў — нярэдка «цёзкі» пэўных рэгіёнаў. А ўсё, што выраблена за іх межамі ці не з іх сыравіны, — падробка, бо смак віна залежыць ад вінаграду, а яго ўласцівасці — ад глебы, надвор'я. Словам, мікраклімату, які непаўторны ў кожнай вінаробнай даліне. Што з'яўляецца збольшага праўдай. Тое самае можна сказаць і пра вытворцаў элітных сыроў: там нібыта і дойны статак утрымліваюць па спецыяльным распарадку, і кормяць яго травой, якая расце толькі ў пэўным месцы.

Але ў нашым свеце развітых тэхналогій нават самыя сакрэтныя рэцэптуры не з'яўляюцца, па сутнасці, таямніцай. І ўсе неабходныя інгрэдыенты можна купіць на рынку. Тыя ж закваскі, напрыклад. Ведама, адтачыць тэхналогію, каб забяспечыць якасць канчатковага прадукту, — асобнае мастацтва. Але вопытныя тэхнолагі яго, у прынцыпе, асвоілі. Больш за тое, калі нешта не атрымліваецца, заўсёды можна ўнесці тыя ці іншыя карэктывы. Спосаб вытворчасці і нават рэцэптура могуць насіць розныя сляды варыятыўнасці. Але смак канчатковага прадукту не адрозніш ад сапраўднага. Як жартуюць сучасныя харчовыя хімікі, яны могуць у сваіх прабірках намяшаць любы смак, з усімі водарамі, адценнямі, нюансамі. Прычым выкарыстоўваючы натуральныя складнікі.

Дарэчы, інструмент замяшчэння актыўна і паспяхова выкарыстоўваюць гандлёвыя сеткі па ўсім свеце. Што робіць буйны рытэйл? Бярэ папулярны брэндаваны прадукт, а потым капіруе яго з максімальнай дакладнасцю і выстаўляе на паліцу пад уласнай гандлёвай маркай. Адрозненні ў колеры, смаку, паху іншы раз даступныя толькі дасведчанаму дэгустатару. Затое копію ўдаецца зрабіць, як правіла, значна таннейшай за арыгінал. Хто выйграе канкурэнцыю на паліцы за пакупніка, спадзяюся, тлумачыць не трэба. Калі няма ці амаль няма розніцы, то навошта плаціць больш? Несумненна, ёсць пэўная доля спажыўцоў, якія будуць арыентавацца на арыгінальныя гандлёвыя маркі. Асабліва калі гэтыя брэнды валодаюць міжнародным статусам і доўгай, хвалебнай і легендалізаванай гісторыяй. Але нямала людзей арыентуюцца не на эмоцыі, якія нібы дорыць брэнд, а на кошт. Словам, на замяшчэнні буйны рытэйл ужо даўно і паспяхова зарабляе. Самае цікавае, што копіі робіць па сваёй ініцыятыве. Без якіх-небудзь праграм, што ў той ці іншай ступені падтрымліваюцца дзяржавай.

